**Л.М. Гамеза,**
*дацэнт*

# ЗАСВАЕННЕ ГРАМАТЫЧНЫХ НОРМАЎ – ВАЖНАЯ ЎМОВА ПАВЫШЭННЯ КУЛЬТУРЫ МОВЫ

Нацыянальнае адраджэнне Беларусі, наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай ставяць пытанне аб авалоданні яе нормамі ўсімі жыхарамі рэспублікі. У рашэнні гэтай задачы вялікая роля адводзіцца выкладанню беларускай мовы ў школах, бо менавіта з маладым пакаленнем беларусаў звязваюцца спадзяванні на абуджэнне гістарычнай памяці нацыі.

Для сучаснага стану беларускай мовы характэрна пашыраная варыянтнасць на ўсіх моўных узроўнях. Гэта прадугледжвае неабходнасць выбару з разнавіднасцей моўнай адзінкі найбольш прымальнага варыянта ў якасці нормы, што ўскладняе працэс выкладання вучэбнага матэрыялу, бо патрабуе не толькі прафесіяналізму, але і грунтоўных лінгвістычных ведаў, якія б і забяспечылі ўменне арыентавацца ў сучасным працэсе развіцця беларускай мовы. “Шырокія грамадскія функцыі сучаснай беларускай літаратурнай мовы – адна з найбольш істотных яе рыс, якімі яна адрозніваецца ад іншых адгалінаванняў нацыянальнай мовы беларускага народа – дыялектаў, прастамоўя, паколькі ўсе гэтыя адгалінаванні так ці інакш фукнцыянальна абмежаваны: яны выкарыстоўваюцца толькі ў пэўным асяроддзі носьбітаў і не з’яўляюцца агульнанародным сродкам зносін”, — зазначаў зазначаў беларускі мовавед Л.М. Шакун у “Граматыцы беларускай літаратурнай мовы”.

Як адзначаецца ў “Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў” П.У.Сцяцко, М.Ф.Гуліцкага, Л.А.Антанюк, норма ўяўляе найбольш пашыранае і агульнапрынятае выкарыстанне моўных сродкаў, якое стала ўзорным і таму заканадаўча замацаваным у выглядзе правіл, рэгламентацый. Нормы беларускай літаратурнай мовы – гэта прынятыя ва ўсіх сферах вусных і пісьмовых зносін, у грамадска-маўленчай практыцы адукаваных людзей правілы ўзорнага вымаўлення і напісання, словаўтварэння і словаўжывання, формаўтварэння і формаўжывання, а таксама ўжывання ў звязнай мове сродкаў ідэальнага тэкстаўтварэння з тым, каб дасягнуць лепшага ўзаемаразумення паміж носьбітамі самой мовы.

Вучэнне пра моўную культуру бярэ пачатак з лепшых ўзораў прамоўніцкага мастацтва Дэмасфена, Цыцэрона. У Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладам моўнай культуры былі "словы" Кірыла Тураўскага, казанні Мялеція Сматрыцкага, Лявонція Карповіча, Афанасія Філіповіча, прадмовы да ўласных кніг Францыска Скарыны і Сымона Буднага. Узорам развіцця беларускай літаратурнай мовы сталі творы А. Абуховіча, Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., К. Каганца, Я.Лучыны, Цёткі, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М.Гарэцкага, К. Чорнага, У. Дубоўкі, К. Крапівы і іншыя, працы Ф. Янкоўскага ("Пытанні культуры мовы"), М. Цікоцкага ("Практычная стылістыка беларускай мовы"), якія заклалі асновы новай для беларускага мовазнаўства галіны – культуры беларускай літаратурнай мовы.

Для сучаснай беларускай літаратурнай мовы характэрны арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, лексічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, стылістычныя і іншыя нормы, якія засвойваюцца яшчэ ў школе.

Арфаэпічныя нормы – гэта правілы вымаўлення галосных і зычных гукаў, гукавых спалучэнняў, правілы інтанацыі. Вывучэнне іх развівае моўны слых, здольнасць адрозніваць гукі мовы, адчуваць прыгажосць гучання беларускага слова, стварае аснову для засваення беларускай арфаграфіі, граматыкі.

Для раскрыцця асаблівасцей гукавой сістэмы не трэба складаных разважанняў. Як указваў Л.І Шчэрба, "усе заняткі па фанетыцы ў школе павінны быць зведзены да назіранняў саміх вучняў, пад кіраўніцтвам настаўніка, над іх уласнай мовай". У вывучэнні фанетыкі вялікае значэнне надаецца фанетычнаму разбору, які па сутнасці падагульняе ўсе веды і ўменні па фанетыцы, дапамагае прывесці ў адпаведную сістэму і замацаваць веды, уменні і навыкі па фанетыцы і графіцы, глыбей асэнсоўваць асаблівасці беларускай арфаэпіі і арфаграфіі. Прыклады для вывучэння фанетыкі павінны ахопліваць усе магчымыя пазіцыі гукаў у слове: словы, у якіх няма разыходжання паміж вымаўленнем і напісаннем; адзінкі з аглушэннем зычных на канцы слова, прыклады з зычнымі, мяккасць якіх абазначаецца з дапамогай *ь, і, е, ё, ю, я;* словы з асімілятыўнай мяккасцю; словы з літарамі *е, ё, ю, я* ў пачатку слова, пасля *ь,* пасля апострафа, у становішчы пасля галосных; словы, у якіх глухія зычныя знаходзяцца ў становішчы перад звонкімі; словы з падоўжанымі зычнымі, поўнагалоссе, прыстаўныя і ўстаўныя галосныя і г.д.

Словаўтваральныя нормы патрабуюць правільнага падзелу слоў на значымыя часткі (карані і афіксы), а таксама ведання

спосабаў і законаў беларускай мовы, паводле якіх утвараюцца новыя словы. Як адзначае М.В. Абабурка, “уменне правільна чляніць словы на састаўныя часткі, вызначаць ролю і значэнне іх у маўленні ў значнай ступені дапамагае пазбегнуць памылак, звязаных з напісаннем слова, разуменнем ягонага сэнсу, з выкарыстаннем слова ў пэўным стылі”. Словаўтварэнне звычайна праяўляецца на марфемным узроўні ў такіх часцінах мовы, як назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, прыслоўі.

Марфалагічныя нормы (правілы формаўтварэння і словазмянення ў галіне самастойных часцін мовы – назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў, дзеясловаў, прыслоўяў) цесна звязаны з сінтаксічнымі і вызначаюць ужыванне словаформ і словаспалучэнняў у словазлучэннях і сказах.

Важнай адзінкай правільнасці мовы з’яўляецца захаванне агульнапрынятай лексіка-сінтаксічнай спалучальнасці слоў. Паводле А.Я. Міхневіча, “парушэнне такіх правіл вядзе да ўзнікнення словазлучэнняў, якія не адпавядаюць сінтаксічнай норме”.

Валодаць стылістычнымі нормамі – гэта значыць умець правільна ствараць той ці іншы тэкст. Са стылістычнымі нормамі вельмі цесна звязаны дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, выразнасць, багацце маўлення.

Пры вывучэнні нормаў беларускай мовы вялікая ўвага надаецца творчым заданням, якія дазваляюць тэарэтычныя веды па фанетыцы, словаўтварэнні, марфалогіі, лексіцы, стылістыцы творча развіваць на практыцы. Можна рэдагаваць тэкст, выяўляючы яго немілагучнасць, аналізаваць вусную мову дыктара, сябра, складаць апавяданні на розныя тэмы, прыдумваць загадкі, скорагаворкі. Наогул, працэс навучання мове вызначаецца двухпланавасцю, якая павінна адпаведна ўлічвацца методыкай гэтай вучэбнай дысцыпліны, а іменна засваенне кожнай новай з’явы неабходна разглядаць: 1) у плане ўспрымання мовы; 2) у плане спараджэння мовы. У той жа час гэтыя розныя два працэсы ўзаемаабумоўленыя: успрымання мовы, засваенне моўных ведаў немагчымы чалавекам, які не валодае словам. І, наадварот, дакладнае, выразнае выказванне, багаты запас слоў грунтуюцца на асэнсаванні асноўных, універсальных заканамернасцей функцыянавання моўнай сістэмы. Таму найбольшую карысць дае спалучэнне прынцыпаў, накіраваных на ўспрыманне моўнай сістэмы (паўтарэнне, апераджальнае вывучэнне), і камунікатыўны характар навучання, які стымулюе працэс вывучэння мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ